# VI. ПРАБЛЕМЫ СУПАСТАЎЛЯЛЬНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА, ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ, КУЛЬТУРАЛОГІІ

**В.Ю. Бароўка** (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

## МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ПАЎСТАННЯ 1863 ГОДА Ў БЕЛАРУСКАЙ, РУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ XIX СТАГОДДЗЯ

Адной з яркіх падзей XIX стагоддзя стала паўстанне 1863 года. Практычна адразу яно знайшло адлюстраванне ў мастацтве слова трох зацікаўленых народаў – рускага, польскага і беларускага. Закладзеныя пісьменнікамі пазамінулага стагоддзя лініі інтэрпрэтацыі пэўную канцэптуальную і эстэтычную актуальнасць захоўваюць і зараз.

Першыя па часе творы пра паўстанне былі надрукаваны рускімі пісьменнікамі. Гэта раман-дылогія “Крывавы пуф” У. Крастоўскага і раман-хроніка “Далёкія гады” (1898) С. Арліцкага (С. Акрэйца). “Крывавы пуф” (1875) У. Крастоўскага складаўся з дзвюх частак. У першай частцы “Панургаў статак” (1869) падаецца пярэдадзень паўстання, расказваецца пра ўзаемадачыненні будучых паўстанцаў з рускімі “новымі людзьмі”. У другой частцы дылогіі “Дзве сілы : хроніка новага смутнага часу дзяржавы расійскай” увага засяроджваецца на паўстанні і асобе Васілія Світкі, арганізатара і аднаго з кіраўнікоў паўстання, што звязваў надзеі на перамогу з прапагандысцкай дзейнасцю касцёла і абеззямельваннем сялян. Як вядома, Васіль Світка – адзін з псеўданімаў К. Каліноўскага. У трактоўцы У. Крастоўскага, Світка – выдатны прамоўца, стратэг і тактык, прагматык, асоба адначасова трагічная і гераічная, шчыры патрыёт Літвы. Радзіма для Васілія Світкі, як для Конрада Валенрода А. Міцкевіча, вышэй за мараль. Дзеля дасягнення сваіх мэт ён выбірае “шлях ліса”. План Світкі заключаўся ў тым, каб на самым пачатку зліцца з “белымі”, з варшаўскім урадам, а пасля расправіцца з усімі “ясновельможными: Террором и страшным террором надо будет действовать” [1; 237]. Васілій Світка – гарачы прыхільнік славянскага адзінства, бо разумее небяспеку для славян звонку, і ідэй сацыяльнага пераўтварэння грамадства. Ён апантана ненавідзіць панства: “панство, шляхетство, магнатерия – все это гнилые корни, которые надо поскорее прочь и печку подтопить ими” [1; 263]. Світка перакананы, што ў час паўстання “святой мужицкий топор и честный рабочий нож не должны остановиться даже… даже и перед колыбелью панского ребенка” [1; 265].

Будучыя паўстанцы, за выключэннем Бейгуша і Світкі, галоўным чынам характарызаваліся Крастоўскім негатыўна. Узброенае выступленне, з пункту гледжання апавядальніка, не мела шанцаў з-за адсутнасці адзінства ў кіраўніцтве, бо прызначаныя на высокія пасады магнаты ў бунтарных памкненнях не ішлі далей прыгожых слоў, а тыя з іх, хто апынаўся на полі бою, не мелі вопыту і ўяўлення пра ўзброеную барацьбу, як граф Счэнсны Маржэцкі, а сяляне былі на баку ўрада. Па версіі празаіка, сапраўдная барацьба ў 1863 годзе разгарнулася на так званых літоўскіх землях. Крастоўскі падкрэсліваў жорсткасць паўстанцаў, для прыкладу, ксяндза па мянушцы “Робак” (Мацкевіча – В.Б.), даволі падрабязна расказваў пра барацьбу паміж “белымі” і “чырвонымі”, пра разгром “белых”. Характэрна, што станоўчы герой твора рускі інтэлігент-праўдашукальнік Хвалынцаў у рамане з’яўляецца двайным цёзкам Каліноўскага: яго, як і Каліноўскага, завуць Канстанцінам Сямёнавічам. Відаць, такім чынам рускі пісьменнік хацеў акцэнтаваць сваё прыязнае стаўленне да “дыктатара Літвы”. Аўтар “Крывавага пуфа” сцвярджаў, што паўстанне на нейкі момант узрушыла



Рэпазіторый ВДУ

жыццё заходняга краю і палепшыла становішча сялян, бо паны баяліся бессаромна адбіраць зямлю. У фінале рамана ёсць цікавы эпізод: пасля высвятлення спрэчнага пытання паміж панам Катырлам і сялянамі ў прысутнасці прадстаўнікоў афіцыйнай улады сяляне дзякуюць панам за тое, што зрабілі паўстанне: “Бо каб вы ёго не зрабили, тоб нам и по век такого ужитку та шчастя не бачици” [1; 571]. Зместам аповеду даводзіцца, што праблемы, якія існавалі ў грамадскім жыцці Расіі перад паўстаннем, засталіся нявырашанымі. Мастацкая інтэрпрэтацыя паўстання Крастоўскім грунтавалася на публіцыстычных і навуковых матэрыялах таго перыяду, у прыватнасці на “Звестках пра польскі мяцеж у Паўночна-Заходняй Расіі” гісторыка В.Ф.Ратча, напісаных ў 1867–1868 гадах па даручэнні Мураўёва-“вешальніка” (пра рэвалюцыйную тэорыю Каліноўскага, пра ацэнку ім варшаўскіх паўстанцаў, пра сродкі барацьбы) [2; 150–154]. Вобраз часу ўзнікаў у “Крывавым пуфе” ў выніку спалучэння розных дыскурсаў у сістэме аповеду: згадванне пра нігілістаў, пра нацыянальна-вызваленчы рух на ўскраінах Расіі, палітыку царскай адміністрацыі, праз спалучэнне розных пунктаў погляду персанажаў на грамадска-палітычную сітуацыю. Сюжэтнымі лініямі твора, трапнымі дэталямі У. Крастоўскі артыкуляваў прыярытэт маральных каштоўнасцей перад нацыянальнымі, сацыяльнымі, палітычнымі.

С. Арліцкі ў час паўстання працаваў сакратаром Віленскай публічнай бібліятэкі, сам прымаў у ім удзел. Тэма паўстання адбілася ў яго творах “Успаміны інсургента”, “Як я пазбег шыбеніцы”, “Старасвецкія памешчыкі: нарысы заходняга краю”, “Далёкія гады”. Асабісты жыццёвы вопыт лёг у трактоўку падзей. Паўстанне 1863 года, ва ўсведамленні пісьменніка, – наступства памылковай палітыкі царскай адміністрацыі, што не лічылася з этнакультурнай адметнасцю заходніх ускраін. Стаўленне да паўстанцаў у пісьменніка было як да ахвяр абставін.

Эліза Ажэшка з’яўлялася сведкай падзей 1863года, яе муж за ўдзел у паўстанні быў сасланы ў Сібір. Пра паўстанне Ажэшка мімаходзь згадвала ў рамане “Над Нёманам (1887). Гэты час дыпламатычна характарызаваўся наступным чынам: “І так было ў нас шумна, так віравала жыццё” [3; 150–154]. Паўстанне падавалася як гераічная з’ява, што аб’яднала лепшых прадстаўнікоў шляхты. Потым з’явілася кніга з пяці навел “Gloria victis” (1910), дзе апяваліся паўстанцы, што ахвяравалі сабой у імя свабоды. Тэма паўстання 1863 года знайшла глыбокае асэнсаванне ў прозе Стэфана Жэромскага. Пісьменнік з дзяцінства чуў шмат аповедаў пра 1863 год, бо ў яго родных мясцінах некалі ішлі баявыя дзеянні. У 1883–1884 гадах Жэромскі працаваў над раманам “Фрагмент фрагмента”, падзеі якога адбываліся на радзіме пісьменніка. У 1894 годзе было надрукавана апавяданне “Расклюе нас груганнё…”, дзе па сюжэце селянін скідвае ў яму параненага паўстанца, бо кіруецца сацыяльнай помстай. На пачатку 1905 года з’явілася апавяданне “Рэха лясоў”, а ў 1912 годзе – аповесць-“сямейнае паданне”, па аўтарскім жанравым вызначэнні, “Верная рака”. “Рэха лясоў” – псіхалагічнае асэнсаванне паўстання 1863 года, дзе паўстанне трактуецца як грамадзянская вайна на тэрыторыі этнічнай Польшчы. Аповесць “Верная рака” – пісьменніцкая версія прычын паражэння паўстання. У ёй няма батальных сцэн, імён вядомых паўстанцаў, але надзвычай пераканаўча адлюстравана становішча людзей у экстрэмальнай сітуацыі. Паказ барацьбы за вольнасць пазбаўлены рамантычнай стылістыкі: узброенае процістаянне – жорсткасць з абодвух бакоў, незлічоныя ахвяры, спалучэнне гераізму і здрадніцтва. Варта прыгадаць жахлівы малюнак, які прадстаў перад вачамі маладога князя Юзафа Андравонжа пасля бою: “Сотни трупов громоздились перед ним в предрассветном тумане, подобно белой горе. Это были раненые, которых прикончили по приказу их соотечественника и недавнего заговорщика, теперь одного из вражеских командиров, – трупы, обобранные до нитки вражескими солдатами, растерзанные штыками, десятки раз пригвожденные к земле офицерскими шашками, черепа, размозженные пистолетными выстрелами в упор, раздавленные колесами пушек Ченгерия. Далеко вокруг песчаная почва порыжела от крови, которая до последней кап-



Рэпазіторый ВДУ

ли вытекла из этих трупов” [5; 22]. Князь Юзаф ішоў змагацца за свабоду, але для яго стала нечаканасцю памкненне вяскоўцаў арыштаваць параненага паўстанца. Стары кухар шляхецкага дома ў Няздолах заявіў параненаму: “Из-за тебя дом сожгут, красная сволочь! Мало тебе, что амбары и сарай сожгли, черт окаянный. Вон отсюда сию минуту” [5; 37]. Аўтар з захапленнем пісаў пра прыгажуню Саламею, “вечнага” паўстанца яе бацьку і сваякоў-інсургентаў, што змагаліся за свабоду, нягледзячы на смяротную небяспеку. Паўстанне падаецца ў аповесці як шляхецкае ў сваёй аснове. Прычына паражэння (хаця аўтар заканчвае аповед пра яго падзеямі чэрвеня 1863 года) – жорсткае абыходжанне царызму з мірным насельніцтвам і паўстанцамі, сацыяльныя забабоны ў грамадстве, якія аказаліся мацнейшымі за патрыятычныя пачуцці. Заціснутыя паўсядзённымі клопатамі сяляне былі далёкія ад ідэй барацьбітоў, лічылі, што пан і хлоп не могуць стаяць побач. Маладыя арыстакраты, як князь Юзаф, часта выбіралі шлях паўстанца, але іх сем’і не падтрымлівалі такія памкненні.

Першы твор пра паўстанне ў беларускай літаратуры быў напісаны на польскай мове Янкам Лучынам (мастацка-дакументальны абразок “З крывавых дзён (Эпізод з паўстання 1863 года на Міншчыне)”, 1889). Падчас паўстання Янку Лучыну было толькі 12 год. Адносна абразка “З крывавых дзён” пісьменнік зазначаў у лісце да рэдактара варшаўскага часопіса “Życie”: “Напісаў я абразок аб падзеях 1863 года і так задаў перцу і імбіру, што, напэўна, адбыў бы падарожжа за ўрадавы кошт, калі б мая пісаніна трапіла ў належныя рукі… Шчырая праўда з’яўляецца фонам апавядання” [1; 200]. Ва ўступе Я.Лучына назваў паўстанне перыядам, які сабраў “шмат праяў звышчалавечага гераізму” [4; 146]. Паводле пісьменніка, паўстанне ў Мінскім ваяводстве працягвалася чатыры месяцы: “Ахінула яно пакрывалам жалобы амаль усе шляхецкія дамы, бо не было сям’і, якая не аплакала б хоць аднаго з сваіх членаў, што загінуў у паўстанні, быў пасаджаны ў турму, пакутаваў сярод ільдоў Сібіры ці ў капальнях Урала” [4; 161]. Я.Лучына расказаў пра партызанскія дзеянні ў Ігуменскім павеце, пра паход інсургентаў пад кіраўніцтвам Баляслава Свентарэцкага і Станіслава Ляскоўскага, афіцэра генеральнага штаба расійскіх войск. Паўстанне ў асвятленні пісьменніка – справа галоўным чынам маладых шляхціцаў, малавопытных, але патрыятычна настроеных. Сяляне заставаліся абыякавымі да адозваў Нацыянальнага камітэта, дзе іх абяцалі надзяліць зямлёй, часта выдавалі інсургентаў царскім уладам з-за прагматычных памкненняў: “Не хочучы ідэалізаваць факты, я мушу тут дадаць, што колькасць асоб, выдаваных у рукі ўлад проста зменшылася, калі паменшала за гэта ўзнагарода” [4; 160]. Аповед пра барацьбу аўтар спалучаў са згадваннем пра незвычайныя “аптычныя з’явы” (падвойныя сонцы і месяцы на небе, паўночнае ззянне ў снежні 1862 года), што нарадзіла пагалоску пра надыход крывавых падзей; пра знаходлівасць паўстанцаў і іх камандзіра, які, каб падмануць праціўніка, загадаў набраць у карчомным калодзежы 50 вёдзер вады дзеля стварэння ў карчмара і вайсковага праціўніка ілюзіі шматлікага ўзброенага атрада; пра спачуванне змагарам многіх рускіх людзей (маладых гімназістаў, салдат-інвалідаў).

Пры адрозненні пісьменніцкіх канцэптуальных ацэнак паўстання і эстэтычных пазіцый звяртае на сябе ўвагу падабенства, што наглядаецца ў трактоўцы гэтай гістарычнай падзеі аўтарамі XIX стагоддзя як праблемы разгорнутай у часе этыкі.

## Літаратура


1. Крестовский, В. Кровавый пуф: роман в двух книгах. Книга 2: Две силы / В. Крестовский. – М.: Современный писатель, 1995. – 576 с.
2. Каліноўскі, К. За нашу вольнасць, творы, дакументы / К. Каліноўскі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1999. – С. 150–154.
3. Жеромский, С. Верная река: семейное предание / С. Жеромский. – М.: Худ. лит., 1963. – 199 с.
4. Лучына, Я. Творы / Янка Лучына. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 214 с.




Репозиторий ВГУ